«Нашы магчымасці ў тым, што мы не спыняем вытворчасць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Што маю на ўвазе: гэтым псіхозам (ад каранавіруса. — **«Зв.»**) сёння практычна спынена эканоміка свету. Нават Расійская Федэрацыя, падобная да нас па ўмовах, — і тая таксама пачала згортваць вытворчасць. Вы бачыце, што адбываецца ў эканоміцы, — растлумачыў Прэзідэнт. — Злучаныя Штаты Амерыкі (я гэта крытычна ўспрыняў і цяпер ужо магу пра гэта сказаць), калі Трамп аб'явіў надзвычайнае становішча, я гэта вызначыў як надзвычайную недальнабачнасць і глупства, скажу шчыра, з боку кіраўніцтва ЗША. ***Але Трамп, як чалавек, які некалі займаўся бізнесам, хутка сарыентаваўся. Апошняя яго заява мне вельмі спадабалася. Ён сказаў так: калі мы неадкладна не вернемся на прадпрыемствы і не пачнём працаваць, то праз беспрацоўе памрэ больш амерыканцаў, чым ад каранавіруса».***

Без закрыцця граніц Беларусь кантралюе сітуацыю

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу работнікаў завода, што менавіта з гэтай прычыны ён не закрываў ніводнае прадпрыемства.

«Хоць дарадцаў было мора: закрыць граніцы, закрыць прадпрыемствы, усіх пасадзіць на каранцін... Тады ***мною было прынятае жорсткае рашэнне — рабіць будзем толькі тады, калі трэба»,*** — расказаў ён.

Прэзідэнт зноў паўтарыў сваю пазіцыю: рабіць каранцін з-за віруса неразумна, бо кожную вясну колькасць вірусных захворванняў павялічваецца, а сёлета толькі дадалося новае.

Тое, што сітуацыя не з'яўляецца надзвычайнай, дэманструе статыстыка: абсалютная большасць з усіх, хто цяпер знаходзіцца ў стацыянарах нашай краіны з прычыны каранавіруса, альбо здаровыя, альбо не маюць сімптомаў хваробы. Толькі некалькі чалавек захварэлі сур'ёзна, пераважна гэта людзі сталага ўзросту, якія маюць іншыя захворванні.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе пацверджаныя выпадкі заражэння ў Беларусі — завезеныя з-за мяжы. Пры гэтым усе, хто прыбывае ў краіну, узятыя пад кантроль.

«Калі выяўляем вірус у чалавека, мы адразу з дапамогай міліцыі, КДБ, відэакамер высвятляем, з кім ён кантактаваў, — праінфармаваў кіраўнік дзяржавы. — Так мы вызначылі 340 кантактаў чалавека, які прыбыў з Італіі і маўчаў, пакуль яму дрэнна не стала. Уся сістэма аховы здароўя, праваахоўныя органы, усе спецслужбы займаюцца сваёй справай і забяспечваюць бяспеку нашага народа».

Адказам на тое, што вірус у Беларусь завезены, сталі мерапрыемствы на граніцы, пры гэтым без яе закрыцця. Былі вызначаны тры «зялёныя калідоры» для транзітнага грузапатоку.

«Майце на ўвазе, ***яны ж не проста едуць. Мы грошы ад гэтага маем, няхай невялікія, але маем. Эканоміка працуе,*** — сказаў беларускі лідар. — І па гэтых калідорах перамяшчаюцца туды і назад велікагрузы. Мы вызначылі, дзе ім паесці можна, дзе можна заправіцца. ***Мы за два тыдні не атрымалі ніводнай праблемы ад кіроўцаў гэтых велікагрузаў».***

Такім чынам, без закрыцця граніц Беларусь, па словах яе кіраўніка, кантралюе сітуацыю на ўездзе і на выездзе.

«Мы рэагуем па сітуацыі, — растлумачыў лідар краіны. — ***Калі ёсць нейкі факт, мы неадкладна ў гэтым кірунку працуем».***

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што вельмі ўважліва цяпер сочыць за падзеямі ў свеце, асабліва за Італіяй, дзе была вялізная ўспышка захваральнасці.

Кіраўніцтва Беларусі займаецца процізпідэмійлагічнымі мерапрыемствамі, але робіць гэта ціха і без пылу, запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

«Каранавірус скончыцца. Псіхоз гэты скончыцца праз месяц-два. А эканоміка абвалілася ў свеце. Прадпрыемствы не працуюць. Гэта і на нас паўплывала», — дадаў беларускі лідар.

Адкуль узяцца грашам, калі спыняцца прадпрыемствы? Калі запускаць друкарскі станок, то ці гатовы людзі да таго, што праз гэта падымуцца цэны ў крамах, спытаў субяседнікаў Прэзідэнт.

«Нам хапае не толькі завезенага каранавіруса, але і эканамічных праблем, — сказаў ён. — Нам іх падкінуць звонку, дык навошта дадаваць унутры краіны? Таму я не зачыняў ніводнае прадпрыемства. Наадварот: калі ўласнік, не дай бог, прыняў бы гэта рашэнне, мы б з ім пачалі спакойна спачатку разбірацца. Чаму закрыта прадпрыемства? І як людзей карміць? А з кіраўніцтвам дзяржаўнага прадпрыемства ўвогуле размова кароткая. Трэба працаваць».

У Беларусі сёлета назіраецца змяншэнне колькасці лятальных выпадкаў у выніку хвароб у цэлым, і ў выніку пнеўманіі — у прыватнасці, паўтарыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу аўдыторыі на тое, што цяпер у свеце вельмі многія, палітыкі і не толькі, спрабуюць сітуацыю з пандэміяй выкарыстаць у сваіх інтарэсах.

«Падумайце: каму трэба і як хто скарыстаўся? Нехта аб'явіў, што гэта вайна — трэба «жоўтыя камізэлькі» прыбраць з вуліц, у некага выбары, у некага яшчэ нешта, кожны пачынае круціць. З агнём жартуюць. Але мы на гэту тэму пагаворым потым, — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка. — З'явілася шмат ахвотных хайпануць на гэтай тэме ў інтэрнэце».

Падчас разважанняў пра неабходнасць закрыцця прадпрыемстваў важна памятаць, што ніхто Беларусі нічога задарма не дасць. У Расіі аб'яўлены тыдзень выхадных, але там вялікія золатавалютныя рэзервы і дастатковы Фонд нацыянальнага дабрабыту.

«І потым, ну хто там на выхадных? Нафта і газ пампуюцца. А назад ідзе валюта. У нас гэта ёсць? — спытаў беларускі лідар і адказаў: — У нас гэтага няма».

Тым больш што ўсе сябры і саюзнікі цяпер закрыліся адзін ад аднаго.

«Выжываць трэба, нібы ты адзін у свеце, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. ***— Разлічваць трэба на сябе, калі жадаеш быць суверэнным і незалежным. Мы адназначна выжывем».***

Яшчэ адзін пасыл кіраўніка дзяржавы — жыццё змяняць не трэба.

«Лічу, што ў вострыя перыяды, калі няма неабходнасці, нельга жыццё людзей змяняць. Можа, вы ўжо перахварэлі на гэты каранавірус. Калі 60 працэнтаў насельніцтва перахварэе, вірус сам знікне. Я жыву тым жа жыццём, што і жыў. Калі жыццё змяніць, упэўнены, што будзе горш», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму жывіце і працуйце спакойна, не напружвайцеся. І не думайце, што вы працуеце, а мы сядзім і не бачым, што адбываецца, — папрасіў Прэзідэнт. ***— З голаду не памром, гэта дакладна. А вось у прамысловасці ні ў якім выпадку нельга згортваць работу».***

Уся вертыкаль улады арыентаваная на дапамогу старым

Прэзідэнт лічыць шкоднымі такія меры, як аб'яўленне дадатковых канікул і выхадных дзён. Што датычыцца дзяцей на канікулах, то іх трэба займаць, іх трэба даглядаць. Але самае небяспечнае, што дзеці, якія самі лёгка пераносяць вірус і аказаліся свабодныя ад заняткаў у школе, могуць заразіць сваіх сталых сваякоў.

У гэты перыяд, калі хаджэнне інфекцыі ў грамадстве актыўнае (размова не толькі пра каранавірус), людзям, старэйшым за 75 гадоў, варта пасядзець дома і мець менш зносін з маладым пакаленнем, паўтарыў Прэзідэнт.

«Мы, вядома, мабілізавалі ўсіх, каб адзінокім старым маглі прывезці лекі, прадукты харчавання. БРСМ адгукнуўся першы, і прафсаюзы кантралююць гэта пытанне, — праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка. — ***Дадзена каманда ўсёй вертыкалі ўлады — ад урада да старшыні выканкама і сельсавета. Калі пажылому чалавеку нешта трэба, ён не павінен шукаць нейкі асаблівы тэлефон. Павінен пазваніць у сельскі Савет, у райвыканкам, адміністрацыю горада, папрасіць дапамогу і сказаць адрас».***

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для такой работы не патрэбна ствараць адмысловыя штабы.

«Выканкам або сельскі Савет — гэта і ёсць штаб. Яны павінны ў гэты час аказаць падтрымку людзям», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У сённяшняй сітуацыі медыцынскія ўстановы часткова пераарыентаваныя, а інфармаванне насельніцтва арганізавана Адміністрацыяй Прэзідэнта. І тут таксама не павінна быць лішніх мер і падмены паўнамоцтваў, упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

«Я ўжо 10 дзён кантралюю работу Міністэрства аховы здароўя і ўрачоў і катэгарычна забараніў мікрабіёлагам, эпідэміёлагам, урачам прымаць рашэнні па закрыцці прадпрыемстваў. Іх справа — лячыць людзей у любой сітуацыі, якая ўзнікне, — заявіў кіраўнік дзяржавы. ***— Забараняць і зачыняць, па Канстытуцыі, у нашай краіне мае права толькі Прэзідэнт. Прыходзьце, даказвайце, што трэба нешта зачыніць, — зачынім. Урач павінен лячыць, журналіст — інфармаваць. Кожны павінен займацца сваёй справай».***

«Ад Расіі не закрыешся. І мы не будзем закрывацца»

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў плане распаўсюджвання каранавіруса яго больш за іншыя краіны хвалюе сітуацыя ў Расіі.

«Ад Расіі не закрыешся. І мы не будзем закрывацца. Яны паспрабавалі... Як ездзілі, так і ездзяць, — заўважыў Прэзідэнт. — І людзям ты не забароніш. Нават з блокам НАТА: на польскай граніцы, як за мінулыя суткі мне далажылі, 130 чалавек туды-сюды хадзілі — па карце паляка, гандляры кожны дзень перамяшчаюцца...»

Павінен быць парадак, але трэба разумець, што немагчыма ў глабальным свеце закрыцца, дадаў кіраўнік дзяржавы. Што датычыцца выкарыстання магчымасцяў падчас крызісу, то на бядзе зарабляць нельга, але нашы магчымасці ў тым, што мы не спыняем вытворчасць, і калі іншыя дзяржавы будуць аднаўляцца, мы зможам працаваць як працавалі. У гэтым наш плюс.

Памятаць пра памяць

Нягледзячы на сённяшнія падзеі і сітуацыю ў суседніх краінах, Беларусь ніякія святочныя мерапрыемствы да Дня Перамогі адмяняць не будзе. Прэзідэнт паабяцаў, што незалежна ад абставін свята Перамогі ў негатыўнай, «хворай» інфармацыйнай плыні не згубіцца.

«Мяне часта пытаюць: а вы прыедзеце на парад? Калі з Беларусі ніхто не прыедзе на парад у Маскву, то хто тады ўжо туды паедзе? — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Але ў мяне адна праблема. У нас жа дакладна тыя ж мерапрыемствы, у той жа час».

Адміністрацыя Прэзідэнта сёння разважае, як зрабіць так, каб Аляксандр Лукашэнка змог наведаць парад у Маскве, і ўзяць удзел у святкаваннях у беларускай сталіцы.

Прэзідэнт нагадаў таксама аб неабходнасці добраўпарадкаваць да падзеі мемарыялы.

«Вы павінны зрабіць гэта і на самым высокім узроўні правесці гэта мерапрыемства. Каб нашы дзеці і ўвесь свет бачылі, што мы памятаем гэта, таму што Беларусь — гэта жывы напамін аб той страшнай вайне. Больш, чым Беларусь, ні адна краіна не пакутавала», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Марыя ДАДАЛКА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Далучайцеся!

ЗЯЛЁНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

Мінпрыроды запрашае да ўдзелу ў экалагічнай кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму!»

На працягу года ў краіне пройдуць шматлікія мерапрыемствы па добраўпарадкаванні гарадоў, раёнаў, жылых двароў, мемарыяльных комплексаў, паркаў і прыродных аб'ектаў. Далучыцца ці арганізаваць сваю «зялёную» акцыю можа кожны.

— Мы заклікаем усіх жыхароў нашай краіны, грамадскія аб'яднанні і арганізацыі актыўна ўключыцца на працягу года ў гэтую экалагічную кампанію, — сказала **начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна КАНАНЧУК.** — Кожны можа зрабіць свой унёсак у паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя і захаванне памяці гераічнай перамогі нашых продкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Таццяна Кананчук адзначыла, што ў мінулым годзе шмат людзей прынялі актыўны ўдзел у кампаніі. Прычым не толькі ў акцыях і мерапрыемствах, агучаных ці запланаваных у рамках рэспубліканскага плана па навядзенні парадку на зямлі, але і ў грамадскіх ініцыятывах, напрыклад, «Зробім!», «Плогінг Беларусь» і іншых. Так, летась падчас забегаў актыўныя грамадзяне сабралі 1,4 тоны смецця. З удзелам насельніцтва было створана 52 тысячы га новых лясоў, у рамках акцыі «Чысты вадаём» у парадак прыведзена 1,2 тысячы км берагавой лініі вадаёмаў і вадацёкаў, добраўпарадкавана амаль 3000 прыдамавых тэрыторый, а таксама 7665 мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой славы, пахаванняў воінаў, іншых памятных месцаў. Валанцёры таксама абследавалі 625 крыніц — сёлета праца па іх добраўпарадкаванні прадоўжыцца.

Дзе ж можна прыкласці свае сілы ў 2020-м? Гэта традыцыйныя акцыі па пасадцы дрэў вясной і восенню; на май-чэрвень запланавана добраўпарадкаванне экалагічных сцежак, а на верасень — велапрабегі ў рамках Дня без аўтамабіля і іншыя мерапрыемствы. Каб заняцца добраўпарадкаваннем ці азеляненнем тэрыторый, дастаткова звязацца з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды — яны падкажуць, дзе неабходна такая дапамога.

Па словах Таццяны Кананчук, прыродаахоўнае ведамства таксама вітае і гатова падтрымаць і экалагічныя ініцыятывы ад грамадзян, грамадскіх аб'яднанняў.

Можна дапамагчы прыродзе і не выходзячы з дому — напрыклад, далучыцца 28 сакавіка да глабальнай экалагічнай акцыі «Гадзіна Зямлі — 2020». У гэты дзень трэба будзе адключыць святло і іншыя не жыццёва важныя электрапрыборы на адну гадзіну з 20.30 да 21.30.

— Мэта акцыі — не столькі сэканоміць электраэнергію, колькі звярнуць увагу жыхароў нашай краіны на пытанні аховы навакольнага асяроддзя, — адзначыла Таццяна Кананчук. — Мінпрыроды таксама накіравала рэкамендацыі розным арганізацыям, чаму важна падтрымаць гэтую ініцыятыву і адключыць падсветку на будынках.

Экалагічная кампанія «Добраўпарадкуем малую радзіму!» стартавала два гады таму ў рамках правядзення ў Беларусі 2018—2020 гадоў пад знакам Года малой радзімы. Сёлета яна прысвечана 75-годдзю Вялікай Перамогі.

Які горад самы зялёны?

Азеляненне тэрыторый населеных пунктаў — яшчэ адзін кірунак, дзе патрэбна дапамога неабыякавых. У мінулым годзе пры ўдзеле беларускіх грамадзян многія куткі краіны зазелянелі — усяго было высаджана 551,9 тысячы дрэў і 516,9 тысячы кустоў.

— Нашы тэрытарыяльныя органы ўжо цяпер займаюцца зборам інфармацыі і прапаноў ад насельніцтва па азеляненні тых тэрыторый, якія найбольш востра маюць у гэтым патрэбу, — расказаў **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — Гэтая інфармацыя будзе абагульняцца і размяшчацца на сайтах камітэтаў. Зразумела, не ўсе тэрыторыі падыходзяць для азелянення. Так, непрыдатныя для пасадкі ўчасткі пад інжынернымі сеткамі, камунікацыямі, а таксама паблізу сцен будынкаў.

Па словах Мікалая Свідзінскага, некаторыя рэгіёны краіны, асабліва паўднёвыя і заходнія, ужо падключыліся да гэтай работы: за мінулы і бягучы тыдзень было высаджана каля 25 тысяч дрэў і кустоў. Усяго ж сёлета плануецца папоўніць «зялёны фонд» гарадоў на 217 тысяч штук гэтых раслін. І асаблівая ўвага будзе ўдзелена выкананню тэхналогій азелянення і высокай якасці работ.

Дзякуючы праведзеным у мінулым годзе мерапрыемствам зялёных тэрыторый у гарадах і раённых цэнтрах стала больш на 2592,3 га, а ўзровень азелянення дасягнуў патрэбнага паказчыка (40 % ад агульнай тэрыторыі) у 88 населеных пунктах. У цэлым па краіне ён выконваецца ў 72 % гарадоў і райцэнтраў.

Паводле даных Мінпрыроды, у сталіцы сёння ўзровень азелянення складае 42 %. Сярод абласных цэнтраў ён таксама выконваецца ў Брэсце (45,3 %), Віцебску (49 %) і Гомелі (41,7 %), а вось Магілёў (32,4 %) і Гродна (31,1 %) пакуль адстаюць па гэтым паказчыку. Самымі зялёнымі ў краіне можна назваць г.п. Акцябрскі (64,8 %), гарады Лельчыцы (64,2 %), Брагін (63,8 %), Карму (62,9 %) і Капыль (61,3 %). У канцы ж гэтага своеасаблівага рэйтынгу пакуль Ваўкавыск (27,3 %), Міёры (24,6 %), Слонім (24,5 %), Лёзна (24,1 %) і Масты (21,2 %). Дапаможам гарадам пазелянець!

Вераніка КОЛАСАВА.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Бодак Але Мікалаеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

АЦЭНЬВАННЕ І МАТЫВАЦЫЯ...

РАБОТА ЗА ЎЗНАГАРОДУ

— Працаваць будзем над праблемай матывацыі і, як мне здаецца, маніпулявання / спекулявання баламі ў нашай школе. Якія складанасці ёсць? Як яны праяўляюцца? Што можна зрабіць, не разбураючы 10-бальную сістэму ацэньвання? Ці ёсць альтэрнатывы? Як інтэграваць у нашу сістэму адукацыі найлепшы сусветны вопыт? Ці можам мы матываваць без адзнак і балаў? — акрэсліў праблемнае поле Яўген Луферчык.

«Памылку ўсе разглядаюць як катастрофу, як прысуд, а не як пункт росту. Дзеці панічна баяцца памыліцца».

— Навошта школьнік вучыцца? Што яму трэба ад установы адукацыі і педагога? Ці патрэбна яму адзнака (ацэнка)? Амаральнасць адзнак — аспект, пра які я асабіста ніколі ўсур'ёз не разважала. Можа быць, прыйшоў час? — падкінула аргументаў у «агонь» дыскусіі Валянціна Чэкан.

Яўген ЛУФЕРЧЫК: «Што можна зрабіць, не разбураючы 10-бальную сістэму ацэньвання? Ці ёсць альтэрнатывы?»

У грамадстве нярэдка абмяркоўваецца пытанне аб'ектыўнасці (суб'ектыўнасці) школьных адзнак. Самі педагогі прызнаюць, што як толькі ў пачатковай школе ўводзіцца ацэначная сістэма, паводзіны вучня тут жа пачынаюць уплываць на яго адзнакі па розных прадметах. Не падабаецца настаўніку штосьці (дзіця раздражняе яго сваёй актыўнасю (пасіўнасцю), задае шмат пытанняў, падвяргае сумненню меркаванне настаўніка, на ўсё мае ўласны погляд), значыць, церпяць яго адзнакі. Некаторыя педагогі не ставяць найвышэйшы бал, таму што лічаць: у такім разе яны пазбавяць вучня стымулу расці і ён будзе спачываць на лаўрах. А ёсць і тыя, хто кажа: «На дзесяць балаў я і сам не ведаю»...

І ўсё ж давайце прызнаемся: мы не ўяўляем сабе школу без адзнак. Вучыцца — азначае для нас атрымліваць адзнакі. Ацаніць работу вучня — значыць абавязкова паставіць яму адзнаку. Каб пакараць ці падтрымаць дзіця, выстаўляецца адзнака ў дзённік і журнал. Бацькі пытаюцца ў дзяцей пра тое, што яны атрымалі ў школе (а тыя думаюць, што ходзяць туды па адзнакі). У гутарках з сябрамі ці калегамі цікавяцца, як вучацца іх дзеці... Галоўнае ў нашым грамадстве — мець добрыя адзнакі. І гэтыя чаканні перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Дзеці прызвычайваюцца працаваць за ўзнагароду.

Калі настаўнікам падчас адукацыйнага бранча было прапанавана сфармуляваць праблемы матывацыі, паставіўшы сябе на месца вучня, і разабрацца з тым, чаму яму страшна, складана, чаму ён не паспявае, не разумее, навошта патрэбная ўся гэтая інфармацыя, што даецца на ўроку, і гэтай далей, яны ў выніку канстатавалі, што школьная сістэма стварае неўротыкаў і бацькі гэтаму таксама спрыяюць. Ім уласцівая вельмі моцная звычка — ацэньваць усё ў балах. Дзіця імкнецца адпавядаць бацькоўскім чаканням. Яно думае, што яго не будуць любіць, калі атрымае нізкую адзнаку. А памылку ўсе разглядаюць як катастрофу, як прысуд, а не як пункт росту. Дзеці панічна баяцца памыліцца.

— Маці ў прысутнасці сына-адзінаццацікласніка кажа настаўніку: «Калі ён не паступіць, гэта будзе канец свету!» І што думае пры гэтым сын? — пытае Валянціна Чэкан.

— Многія праблемы сучаснага грамадства вырастаюць са школы і страху, — канстатуе **настаўнік матэматыкі цэнтра дадатковай адукацыі «Адукацыйная прастора «Краіна сяброў», аўтар праекта «Па той бок лікаў» Ягор ДАЎГАЛЕВЕЦ.**

КНІГА — ПРЫЧЫНА ІНТЭЛЕКТУ?

Між іншым, праведзенае ў чатырох расійскіх рэгіёнах даследаванне, якое ахапіла 1,5 тысячы вучняў, паказала, што вучні і настаўнікі маюць розныя ўяўленні адносна сістэмы ацэньвання на ўроку і яе аб'ектыўнасці, у тым ліку рознае разуменне крытэрыяў.

Не сумняваюцца ў аб'ектыўнасці ацэньвання толькі 43 працэнты школьнікаў, прычым з пятага да дзясятага класа ўпэўненасць у яго аб'ектыўнасці зніжаецца. Між іншым, крытэрыі ацэньвання разумеюць усяго 49 працэнтаў школьнікаў. Затое 99 (!) працэнтаў педагогаў

Валянціна ЧЭКАН: «Амаральнасць адзнак — аспект, пра які я асабіста ніколі ўсур'ёз не разважала. Можа быць, прыйшоў час?»

абсалютна ўпэўнены ва ўласнай аб'ектыўнасці!

«Што пры ацэньванні вучэбных дасягненняў навучэнцаў з'яўляецца для вас найбольш важным?» — пацікавіліся ў педагогаў. 71 працэнт з іх адказалі: «Наяўнасць свайго пункту погляду». 69 працэнтаў указалі на важнасць умення скарыстаць вывучанае на практыцы, 52 працэнты — на веданне вучэбнага матэрыялу, 47 працэнтаў — на ўзаемадзеянне з іншымі вучнямі... Прычым усім гэтым заявам не знайшлося пацвярджэння пры апытанні школьнікаў.

Навучэнцы больш крытычна ставяцца да адзнакі. 88 працэнтаў настаўнікаў лічаць адзнаку ў балах матывавальным фактарам. Сярод школьнікаў такое меркаванне падзяляе толькі 35 працэнтаў ад агульнай колькасці апытаных.

Яўген Луферчык расказаў, што ў ЗША ў 1990-х гадах праводзілася маштабнае даследаванне. Адабраўшы больш за дваццаць тысяч вучняў пачатковай школы па ўсёй краіне, даследчыкі вывучалі іх паспяховасць і збіралі падрабязныя звесткі аб сям'і і пазашкольным жыцці. Навукоўцы выкарыстоўвалі самыя розныя метады — праводзілі анкетаванне, а таксама асабістыя гутаркі з бацькамі, дзецьмі, школьнымі настаўнікамі. У выніку ў іх распараджэнні аказаўся велізарны масіў даных, якія трэба было дакладна трактаваць.

А цяпер паглядзіце на восем фактараў, якія, паводле вынікаў гэтага даследавання, не маюць аніякай узаемасувязі з паспяховасцю:

1. Дзіця расце ў поўнай сям'і.
2. Яго бацькі нядаўна пераехалі ў больш прэстыжны раён.
3. Маці дзіцяці не працавала пасля яго нараджэння і да паступлення ў дзіцячы сад.
4. Дзіця наведвала праграму Head Start (дашкольная адукацыйная праграма для дзяцей з малазабяспечаных сем'яў у ЗША).
5. Бацькі рэгулярна ходзяць з сынам ці дачкой у музей.
6. Дзіця рэгулярна б'юць.
7. Дзіця шмат часу глядзіць тэлевізар.
8. Бацькі дзіцяці чытаюць яму ўголас практычна кожны дзень.

Некаторыя з высноў выклікаюць здзіўленне. Здавалася б, усім зразумела, што доўгае сядзенне перад тэлевізарам шкодзіць вучобе. Але гэта толькі меркаванне, а калі казаць аб статыстычных звестках, то паміж сумарным часам прагляду тэлевізара і вынікамі школьных тэстаў ніякай карэляцыі навукоўцы не знайшлі...

«Калі педагог дае магчымасць памыляцца, істотна змяняюцца паводзіны вучня, дзеці смялей пачынаюць выказвацца, дзяліцца цікавымі ідэямі, задаваць пытанні, агучваць гіпотэзы».

Затое была ўстаноўлена карэляцыя паміж паспяховасцю дзіцяці (матывацыяй да навучання) і адукацыяй яго бацькоў. У адукаваных бацькоў дзіця з вялікай імавернасцю будзе добра вучыцца ў школе. Гэтаму спрыяе і атрыманая ў спадчыну цяга да ведаў, і асяроддзе, у якім малое расце, а таксама тое, што бацькі разумеюць каштоўнасць адукацыі і перадаюць свае жыццёвыя прыярытэты дзіцяці. Устаноўлена таксама сувязь паміж паспяховасцю і наяўнасцю дамашняй бібліятэкі. Дзеці, у якіх дома шмат кніг, вучацца добра. Можна запярэчыць, што калі ў дзіцяці шмат кніг, гэта не заўсёды значыць, што яно іх чытае... Але, як ні дзіўна, і статыстыка гэта пацвярджае, на адзнаках дзіцяці станоўча адбіваецца нават фізічная прысутнасць кніг у доме. Абстаноўка натхняе на вучобу і цікавасць да ведаў. У той жа час, не варта спадзявацца, што, прымушаючы дзіця чытаць кнігі, вы зможаце палепшыць яго школьныя адзнакі. Кніга з'яўляецца ў большай ступені не прычынай інтэлекту, а яго вынікам...

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

А ці можа матываваць да навучання нізкая адзнака? Пытанне зусім не рытарычнае...

— Мне бачыцца неабходным адмовіцца ад «назапашвання» адзнак і вывядзення сярэдняга бала за чвэрць, бо ён не адлюстроўвае рост навучэнца цягам вучэбнай чвэрці і такім чынам дэматывуе. Скажам, нейкі вучань «нахапаў» у пачатку чвэрці дрэнных адзнак. Потым узяўся за розум, падцягнуўся, засвоіў матэрыял і паспяхова скончыў чвэрць. Але сярэдняя адзнака адкідвае яго назад, і ў навучэнца ўзнікае адчуванне, што колькі ты ні старайся, усё роўна добрую адзнаку табе не паставяць, — разважае **выкладчык англійскай мовы Валянціна ГОЛУБЕВА.**

У сусветнай адукацыйнай практыцы мэйнстрымам у апошняе дзесяцігоддзе стала фарміруючае ацэньванне. У Беларусі ўжо больш за дзесяць гадоў у настаўніцкую практыку ўкараняецца актыўная ацэнка (АА). Пры пэўных адрозненнях сутнасць і мэты тэхналогій агульныя — стварэнне зваротнай сувязі для пабудовы індывідуальнай траекторыі навучання. Замест адзнакі ў балах настаўнік каментуе дзейнасць вучня на ўроку, ажыццяўляе зваротную сувязь, якая павінна заахвочваць да далейшай работы. Актыўная ацэнка — больш інфарматыўная, яна падказвае вучню, у якім кірунку яму рухацца далей, дазваляе эфектыўна матываваць выхаванцаў, прымушае іх браць на сябе адказнасць за сваё навучанне. Вучню кажуць, што ў яго атрымліваецца, а над чым яшчэ трэба працаваць ці што трэба дапрацаваць, дзе знайсці патрэбны матэрыял (канкрэтную старонку параграфа, спасылку на інтэрнэт-рэсурс і гэтак далей). Адна са стратэгій АА — вучымся на памылках. Калі педагог дае магчымасць памыляцца, істотна змяняюцца паводзіны вучня, дзеці смялей пачынаюць выказвацца, дзяліцца цікавымі ідэямі, задаваць пытанні, агучваць гіпотэзы. Ёсць яшчэ адзін важны момант — актыўная ацэнка прынцыпова пазбягае канкурэнцыі, на якой пакуль што грунтуецца наша школа. Пры гэтым яна ўпісваецца ў нашу дзесяцібальную сістэму — не адмяняе яе, а дапаўняе. Па часе яна апераджае выніковую.

Між іншым, аўстралійскі прафесар Джон Хэці прааналізаваў за 15 гадоў вынікі больш чым 50 тысяч даследаванняў ва ўсім свеце з сумарным ахопам звыш 86 мільёнаў школьнікаў і распрацаваў своеасаблівы «барометр», які паказвае ўплыў канкрэтных фактараў на навучанне. Найбольш высока ён ацаніў існаванне зваротнай сувязі паміж настаўнікам і вучнем (толькі разгорнутая зваротная сувязь істотна карэлюе з высокімі дасягненнямі), ну і, вядома, настаўніцкія чаканні. «Педагог павінен верыць, што ўсе дзеці могуць вучыцца і развівацца, што навучальныя вынікі любога з іх могуць змяніцца да лепшага, бо не з'яўляюцца раз і назаўсёды зададзенай велічынёй», — сцвярджае Джон Хэці.

Падводзячы вынікі чатырох нефармальных сустрэч, Яўген Луферчык зазначыў: «Для мяне адукацыйныя бранчы сталі крыніцай новых рэсурсаў у рабоце, адкрылі новыя пункты гледжання на развіццё нашай сістэмы школьнай адукацыі, а яшчэ пазнаёмілі з вялікай колькасцю выдатных неабыякавых людзей, якія імкнуцца змяніць сітуацыю да лепшага. Гэта былі вострыя дыскусіі, мноства правільных слоў, ініцыятыўнасць, крэатыўнасць, калектыўная творчасць і прафесійная работа над самымі складанымі кейсамі».

Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.